©ГГУ

# СУЧАСНАЯ ЎРБАНІСТЫЧНАЯ ЛІРЫКА ЯК АДМЕТНАЯ МАСТАЦКАЯ СІСТЭМА

***Д. В. МАЛЬЦАВА*, А. В. БРАДЗІХІНА**

This paper reviews the main trends in modern Belarusian urban lyric poetry. While analyzing its problems and poetics the author argues the validity of perception of the complex of urban poetic texts as an open artistic system.

Ключавыя словы: урбаністычная лірыка, пейзаж, хранатоп, лірычны суб’ект

Горад – своеасаблівы феномен, які можа быць «прачытаны» як тэкст, а таксама як месца спараджэння тэкстаў. Найбольш важнымі катэгорыямі ў яго асэнсаванні з’яўляюцца «гарызанталь – вертыкаль», «верх–ніз». Локус большасці ўрбаністычных тэкстаў у сучаснай лірыцы (Г. Булыкі, І. Бабкова, Г. Дубянецкай і інш.) мае скіраванасць уверх, што звязана з культурнай ідэяй горада – Нябеснага Іерусаліма. Гарызантальная хранатапічная мадэль таксама ўяўляецца перспектыўнай (лірыка А. Глобуса, С. Мінскевіча, Л. Сом і інш.). Пры гэтым адмысловая местачковая ментальнасць беларускіх гараджан спрыяе наданню паэтычным тэкстам прыкмет буколікі, асабліва калі ўрбаністычная тэма спалучаецца з інтымнай (вершы І. Багдановіч, Л. Дранько-Майсюка, Я. Чыквіна і інш.). Увага да тэхнакратычных вобразаў гарадскога пейзажу (транспарту, электрычнасці, тэле-, радыё-, інтэрнэт-рэсурсы, мабільнай сувязі і інш.) абумоўлена ўплывам на свядомасць чалавека паскоранага развіцця НТП (лірыка А. Глобуса, Г. Булыкі, І. Багдановіч, В. Жыбуля і інш.). Падобныя ўяўленні заканамерна адбіваюцца на стылёвым узроўні праз уплыў эстэтыкі метарэалізму ў творчасці А. Глобуса ці «тэхнарамантызм» В. Жыбуля. Аднак тэхналагічная прастора горада можа ўспрымацца і чужародна праз з’яўленне матываў фальшу, маскараду (творы А. Івашчанкі, А. Мінкіна, Л. Дранько-Майсюка).

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Асаблівасці суб’ектнай арганізацыі сучаснай гарадской лірыкі абумоўлены так званым недаўрбанізаваным тыпам ментальнасці беларускіх гараджан. Лірычныя героі-«аўтатрофы» прымаюць горад натуральным асяроддзем і выступаюць непасрэднымі носьбітамі гарадскога міфа (творы Л. Рублеўскай, А. Глобуса). Іншы тып суб’ектаў – «гетэратрофы», што ўспрымаюць горад непазбежным злом (лірыка А. Мінкіна, А. Барскага). У сучаснай лірыцы сцверджаны тэзіс аб тым, што этыка ўрбанізму – гэта этыка самадастатковасці (вершы А. Глобуса, А. Мінкіна і інш.). Але беларускі гараджанін – індывідуаліст, але які атаясамлівае сябе з беларускай нацыянальнай супольнасцю, што рэалізуецца праз канфлікт асабістага з калектыўным (вершы А. Глобуса). Таму і знайшлі ўвасабленне ў вершах праблемы гістарычнай памяці і нацыянальнай самасвядомасці (творчасць Л. Рублеўскай, І. Багдановіч). Канфлікт абстрактна-надасобаснага з асабістым рэалізуецца праз праблему знікнення і пошуку свайго «я» ў межах урбаністычнай прасторы (лірыка Г. Булыкі, А. Глобуса). Аўтары ставяць пад пытанне трываласць маральных-этычных асноў гарадскога жыцця, якое не пакідае дастатковых магчымасцей для фарміравання духоўнай прасторы, што прыводзіць да канфлікту духоўнага з бездухоўным (творчасць Л. Рублеўскай, І. Багдановіч). Канфлікт прыроднага з антрапалагічным, у аснове якога ляжыць сутыкненне прыроднага з тэхнічным, адлюстроўваецца праз эскапічныя матывы (вершы А. Барскага, А. Глобуса, А. Мінкіна).

Горад у пераасэнсаванні паэтаў-урбаністаў паўстае як у свеце эсхаталагічных матываў, так і ў культурна-гістарычнай перспектыве. Сярод першых – гібель горада (творы Л. Рублеўскай, А. Мінкіна) ці ў горадзе, паглынання ім асобы (лірыка В. Трэнас, А. Спрынчан, А. Мінкіна). Адлюстраванне вобраза «вечнага горада» вагаецца ад сакралізацыі топасу да набыцця ім маргінальных прыкмет (вершы Л. Дранько-Майсюка, І. Бабкова). Асноўная асаблівасць рэалізацыі беларускага архетыпу «крывіцкай Меккі» – цесная знітаванасць з матывамі раздарожжа і наяўнасцю праблемы дзвюх сталіц (лірыка А. Глобуса, Л. Сом, В. Аксак).

Такім чынам, сучасная беларуская ўрбаністычная лірыка ўяўляе сабой адметную мастацкую сістэму, а з’яўленне гарадскіх паэтычных тэкстаў бачыцца адным з яскравых шляхоў абнаўлення літаратуры, якая традыцыйна заангажавана на тэму зямлі.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ